Фёдараў М.

# КУЛЯМЁТЧЫК МІХАІЛ РАМАНЬКОЎ

Пад Магілёвам, у маляўнічай мясцовасці раскінулася невялікая вёска Дубінка. Добра жылі тут людзі да вайны, працу іх шчодра аплачвала зямля. Шчаслівa жыла і сям'я калгаснага пастуха Ягора Раманькова.

Дапамагаў бацьку ў працы сынок Міша. З дзяцінства палюбіў ён родныя мясціны. І раптам... вайна. Фашысцкія акупанты захапілі вёску. Насталі чорныя дні.

Непрыкметная, здавалася, у мірны час вёска стала адным з апорных пунктаў партызан. Міша па-ранейшаму пасвіў жывёлу, але ў сэрцы палала нянавісць да захопнікаў. Неўзабаве ён стаў партызанскім разведчыкам.

У адзін з зімовых дзён фашысты акружылі вёску Дубінку. 186 яе жыхароў былі спалены жывымі. У ліку іх былі і бацькі Мішы, два браты і дзве сястры.

Асірацелы Міхаіл Раманькоў змагаўся ў партызанскім атрадзе, а калі прыйшла Савецкая Армія, стаў байцом-кулямётчыкам.

...Пасля разгрому фашыстаў пад Кёнігсбергам вялікая групоўка нямецкіх войск сканцэнтравалася на касе Фрыш-Нерунг. Пясчаная з узгоркамі мясцовасць, якая зарасла нізкім сасняком, ускладняла наступленне нашых падраздзяленняў.

У ноч на 1 мая 1945 года полк, у якім служыў камандзір станкавага кулямёта малодшы сержант Міхаіл Раманькоў, у цемры пераадолеў заліў і з ходу напаў на ворага. Пяць сутак ішлі тут жорсткія баі.

5 мая Міхаіла Раманькова раніла асколкамі ў твар, руку і нагу.

– Адпраўляйся ў санчасць на перавязку, – загадаў камандзір узвода.

– Таварыш лейтэнант, у нас усе навічкі. З кулямётам могуць справіцца толькі Якункін і я. А што, калі Якункін выйдзе са строю?

Ноччу сціх дождж, які ішоў увесь дзень. На досвітку байцы ўбачылі, як ад варожых траншэй хлынула лавіна гітлераўцаў.

– Падпусцім іх блізка і ўдарым, – сказаў Раманькоў наводчыку Якункіну.

Міхаіл прыпаў да кулямёта. А калі варожыя салдаты наблізіліся, ён адкрыў знішчальны агонь. Фашысты заляглі. Тым часам з траншэй рушылі новыя ланцугі гітлераўцаў, але Міхаіл прымусіў і іх залегчы.

Увесь агонь фашысты накіравалі на кулямёт Раманькова. Неўзабаве быў ранен Якункін, а затым быў пашкоджан кулямёт.

Фашысты, думаючы, што агнявая кропка выйшла са строю, кінуліся ў атаку. Але кулямёт, які хутка адрамантаваў Раманькоў, зноў загаварыў.

Эканомячы патроны, воіны білі кароткімі чаргамі. Яны ведалі, чым пагражае прарыў нашай абароны. Але яны ведалі і другое: недзе

недалёка свае, і яны вось-вось павінны прыйсці на дапамогу. І калі засталася апошняя стужка, пачулася магутнае "ура". Фашысты павярнулі назад і кінуліся наўцёкі.

Выпусціўшы апошнія патроны, Раманькоў вылез з акопа. Паказаўся камандзір узвода лейтэнант Гняздзілаў.

– Вы героі, малайцы! – крычаў ён.

У гэты час недалёка разарваўся варожы снарад. Асколкам забіла наводчыка, цяжка быў ранен Раманькоў.

Толькі праз  пяць месяцаў лячэння смелы воін вярнуўся дадому, пачаў працаваць у родным калгасе.

Аднойчы Міхаіла Раманькова выклікалі ў Магілёўскі аблваенкамат. Тут яму ўручылі ордэн Леніна і Залатую Зорку Героя Савецкага Саюза. Адначасова патрыёт атрымаў ордэн Славы 3-й ступені і медаль "За адвагу".

Цяпер Міхаіл жыве і працуе ў Магілёве. У яго трое дзяцей, якія вучацца ў школе.

Міхаіл Ягоравіч часта расказвае сваім дзецям аб гераізме савецкіх людзей.

**Фёдараў, М. Кулямётчык Міхаіл Раманькоў / М. Фёдараў // Звязда. — 1958. — 12 снежня. — С. 4.**